ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
29
САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 11 (1424)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

## тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

### ДЗЕНЬ АДКРЫТЫХ ДЗВЯРЭЙ

прайшоў на геаграфічным факультэце. Жадаючыя вучыцца сустрэліся з выкладчыкамі і студэнтамі факультэта, наведалі вучэбныя і навуковыя лабараторыі, геолагамінералагічны музей, пазнаёміліся з умовамі паступлення.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### ТЭМАТЫЧНЫЯ ПЛАНЫ

«Вышэйшая школа» (ВНУ і тэхнікумы), «Палітвыдавецтва», «Педагогіка» на 1985 год паступілі ў кніжны магазін № 19 «Метадычная кніга». Запрашаем наведаць магазін і пакінуць заказы на плануемыя выданні.

Г. ЧУДЗЯНКОВА,
таваразнаўца.

### НЕЗАБЫЎНАЯ СУСТРЭЧА

са школьнікамі СШ № 20 г. Мінска адбылася ў студэнтаў-замежнікаў, што вучацца на факультэце журналістыкі. Мы з цікавасцю азнаёміліся з выстаўкай малюнкаў навучэнцаў, даведаліся, што школьнікі прымаюць актыўны ўдзел у рабоце музея, які расказвае аб жыцці і дзейнасці правадыра Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі У. І. Леніна. Потым мы расказалі нашым новым сябрам аб сваіх краінах, аб сістэме дашкольнага выхавання і адукацыі, якая існуе ў нас, прачыталі вершы вядомых афрыканскіх паэтаў, выканалі народныя песні. Мы рады, што кола нашых сяброў значна расшырылася.

БОН АНЭ МАТУМОНА,
студэнт факультэта журналістыкі.

### ДАКРАНУЦЦА ДА МІНУЛАГА

дапамагла студэнтам факультэта журналістыкі сустрэча з ветэранам партыі, заслужаным дзеячам культуры БССР М. С. Арэхвай. Уважліва слухалі студэнты расказ Мікалая Сямёнавіча — удзельніка грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, дэлегата трох з'ездаў камсамола, былога адказнага камсамольскага і партыйнага работніка. Пра такіх людзей гавораць: «У яго лёсе — лёс краіны».

З асаблівым хваляваннем ветэран расказваў аб сваёй падпольнай дзейнасці ў Заходняй Беларусі. Пятнаццаць гадоў змагаўся за яе вызваленне М. С. Арэхва, пяць з іх — за турэмнымі кратамі.

І. ЗЫБАЙЛА,
студэнт факультэта журналістыкі.

## РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ

БЕЗ ТАЛЕНТУ людзей няма. Ёсць тыя, хто не знайшоў яшчэ свайго прызвання. Кожны чалавек мае нешта сваё, асабістае, такое, на што больш ніхто ў свеце не здатны. І толькі калі ён адкрые ў сабе гэта «сваё», калі яно стане для чалавека галоўным у жыцці, толькі тады ён будзе па-сапраўднаму шчаслівым. Інга Федарцова, здаецца, сваё прызванне знайшла. Яна — студэнтка 3 курса факультэта радыёфізікі і электронікі, вучыцца на добра і выдатна, у камітэце камсамола адказвае за інтэрнацыянальнае выхаванне студэнтаў. І, як сказаў пра Інгу намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па інтэррабоце В. Шадурскі, яна





не толькі ўмее паспяхова вырашаць усе праблемы, што ўзнікаюць, але і арганізаваць на факультэце цікавую гутарку, экскурсію... Пры яе актыўным удзеле адбылася сустрэча аманскіх студэнтаў са школьнікамі, на факультэце прайшоў тыдзень дружбы з народам Амана. Студэнты факультэта адзываюцца аб Інзе як аб вясёлым, чулым чалавеку.

Балянціна Шаўлюк, наадварот, чалавек вельмі сур'ёзны. Аб гэтым вам могуць сказаць студэнты II курса факультэта журналістыкі. Вось такой «убачыў» яе наш фотакарэспандэнт у час лекцыі.

Фота С. Плыткевіча.

## УВАХОД ДАЗВОЛЕНЫ

**А ведаеце вы, што!.. Што ў нас ва універсітэце трынаццаць факультэтаў! Калі дванаццаць з іх строга акрэслены: на хімічным займаюцца толькі хімікі, на філалагічным — толькі філолагі, то трынаццаты факультэт — факультэт, на якім займаюцца ўсе жадаючыя, як фізікі так і лірыкі. Гэта ФГП — факультэт грамадскіх прафесій. Сёння наш расказ аб адным з яго аддзяленняў.**

### ДЛЯ ЎСІХ ЖАДАЮЧЫХ

Я НЕ ЗАЎВАЖЫЛА, як яна зайшла ў аўдыторыю. Маладая, стройная, яна нічым не адрозніваецца ад студэнтак.

— Я хачу пачуць вашы меркаванні наконт гэтай кампазіцыі, таму што я павінна ісці ад вас, а не вы ад мяне.

Так пачаліся чарговыя заняткі групы дыктараў і вядучых факультэта грамадскіх прафесій. Праводзіць іх актрыса рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага Таццяна Васільеўна Хвосцікава.

— Тэма нашых заняткаў — свісцячыя гукі. Гэта самы распаўсюджаны дэфект нашай мовы, і таму...

І таму схіліліся дзяўчаты над сшыткамі, старанна запісваючы кожнае яе слова. Вам здасца гэта проста: вымаўляць словы. А калі ўважліва прасачыць за нашай мовай, шыпення і свісту ў ёй столькі, што хопіць на асобныя (хай сабе невялікія) участкі тропікаў. І каб пазбавіцца ад гэтага, існуюць спецыяльныя практыкаванні, якія, на першы погляд, могуць здавацца вельмі дзіўнымі. Вось што такое, напрыклад, «дуць у бутэльку» або «адкусваць нітку»? А скорагаворкі? Язык паламаць можна, хоць і кажуць, што ён без касцей.

Ну, а зараз селі роўна. Зробім масаж (лёгкія рухі ад носа да скроняў). Добра. А зараз паспрабуем вібрацыйны (такое ўражанне, што вібрыруе само паветра аўдыторыі).

А потым яны чытаюць вершы. Барыс Пастэрнак, Марыя Цвятаева...

Адпрацоўваюцца дыханне, мяккасць мовы, так называемае «чыста рускае сцэнічнае вымаўленне». Ідзе зацікаўленая размова аб мастацтве, аб прафесіі акцёра.

На сцэне відаць усё: добры ты чалавек ці дрэнны, справядлівы ці злы. Гледача нельга падмануць.

Далей ідзе размова пра спектакль, ролю Афеліі ў якім выконвала Таццяна Хвосцікава: «Усе людзі розныя. Нялёгка адысці ад свайго асабістага «я». Але на сцэне я павінна быць Афеліяй».

Горача, не заўсёды адшукваючы патрэбныя словы, расказвае аб убачаным студэнтка 5 курса механіка-матэматычнага факультэта Наталля Даніловіч:

— Спектакль мне вельмі спадабаўся, але апладзіраваць я не магла. Гэта было нейкае аняменне.

...Званок празвінеў нечакана, спыніўшы размову на самым цікавым месцы. Наступная сустрэча — праз два тыдні.

— Ведаеце, магчыма ніхто з маіх слухачоў і не стане дыктарам,— гаворыць Таццяна Васільеўна, — але любоў да мастацтва, якую я імкнуся прывіць сваім выхаванцам на кожных занятках, дапаможа ім у будучай прафесіі.

Н. ТАРАСАВА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

## НАШ КОНКУРС

### ЛЕПШЫЯ ПУБЛІКАЦЫІ

**РЭДАКЦЫЯ падвяла вынікі конкурсу на лепшую публікацыю ў студзені — сакавіку 1984 года. Па водгуках чытачоў найбольш цікавымі, змястоўнымі і надзённымі прызнаны публікацыі студэнтаў В. Чарняўскага «Мары застаюцца... дома», «Падарунак праз фармуляр!», «Кантрасты, нюансы...», «Зручнасці... адмяняюцца», С. Плыткевіча «Vita—значыць жыццё», У. Абрамовіча «Трынаццаты выхадны», дацэнта механіка-матэматычнага факультэта М. Мяцельскага «Ключавыя пытанні».**

**Віншуем лаўрэатаў конкурсу і жадаем далейшых плённых кантактаў з газетай.**

## ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

### «МАРЫ ЗАСТАЮЦЦА... ДОМА»

ТАК НАЗЫВАЛАСЯ крытычная карэспандэнцыя, змешчаная ў газеце «Беларускі універсітэт» за 12 студзеня гэтага года. У ёй былі ўскрыты пэўныя недахопы ў рабоце кафедры фізічнага выхавання і спорту, спортклуба і клуба турыстаў. У прыватнасці, было закранута пытанне нездавальняючай арганізацыі здачы турысцкіх нарматываў у сістэме комплексу ГПА.

На крытыку адгукнуўся старшыня праўлення клуба турыстаў БДУ імя У. І. Леніна прафесар А. С. Фядэнка:

**— Папярэдняе праўленне турысцкага клуба мала цікавілася гэтай справай. Новае праўленне турклуба гатова аказаць кафедры фізвыхавання і спорту сваю дапамогу ў арганізацыі здачы турысцкіх нарматываў комплексу ГПА.**

На жаль, ніяк не адрэагавалі на зробленыя заўвагі кіраўнікі кафедры фізвыхавання і спорту, спортклуба універсітэта. Яны занялі дзіўную пазіцыю, бо іменна ў адрас кафедры і спортклуба была накіравана сваёй вастрынёй крытыка. Безумоўна, маўчанне кафедры і клуба можна зразумець і як поўнае прызнанне выкрытых хібаў. Але ж становішча неабходна неяк выпраўляць, прымаць неабходныя меры. Наогул, было б цікава даведацца, як праходзіла на кафедры абмеркаванне артыкула. Слова за вамі, паважаныя кіраўнікі універсітэцкага спорту і турызму.

# УНІВЕРСІТЭЦКАМУ ДЫПЛОМУ — ГАРАНТЫЮ ЯКАСЦІ!



● СЁННЯ — ВЫДАТНЫЯ ВЕДЫ, ЗАЎТРА — ЭФЕКТЫЎНАЯ ПРАЦА ●

## ДЫЯЛОГ З МАШЫНАЙ

АДНОЙ з найбольш эфектыўных галін выкарыстання аўтаматызаваных навучальных сістэм (АНС) у курсе хіміі, і ў прыватнасці фізічнай хіміі, з'яўляецца навучанне студэнтаў рашэнню разліковых задач. Гэта можна растлумачыць так. Разліковыя задачы з'яўляюцца асноўным звязваючым звяном паміж тэорыяй і практыкай. Толькі пасля таго, як студэнт, вывучыўшы тэарэтычную частку раздзела, зможа рашаць задачы, што датычацца гэтага раздзела, ён можа лічыць, што засвоіў матэрыял.

З другога боку, разліковыя задачы, з'яўляючыся найбольш фармалізаваным раздзелам хіміі, спрошчваюць матэматычны апарат, неабходны для выкарыстання АНС. Ёсць яшчэ адна перавага заняткаў у спецыялізаваным класе «ЭВНС—БДУ». Рашэнне задач у звычайным класе на звычайных семінарскіх занятках не аднолькава эфектыўна для ўсіх студэнтаў. Дрэнна падрыхтаваныя студэнты не заўсёды паспяваюць поўнасцю разумець ход разважанняў і вымушаны перапісваць рашэнне з дошкі, а найбольш падрыхтаваныя студэнты працуюць не з поўнай нагрузкай. Гэты недахоп адсутнічае на занятках у класе «ЭВНС—БДУ», таму што тут заняткі цалкам індывідуалізаваны. Машына працуе з кожным студэнтам паасобку. Слаба падрыхтаваныя студэнты за час заняткаў паспяваюць рашыць задачы толькі першых двух рангаў. Добра падрыхтаваныя студэнты рашаюць задачы ўсіх чатырох рангаў.

Рашэнне кожнай асобнай задачы праходзіць па аднолькавай схеме як для навучэнца, так і для педагога. Спачатку студэнтам даецца тэкст задачы. Абдумаўшы яго, студэнт можа атрымаць даведку і падказку. Калі гэтага недастаткова, ён можа выклікаць рашэнне задачы па асобных элементах. Калі студэнт дае адказ, які з'яўляецца тыповай памылкай, то яму прапануецца каментарый, які дазваляе знайсці памылку і рашыць задачу правільна. Задача лічыцца паспяхова рошанай, калі студэнт дапамогай не карыстаецца. Падказкі, элементы дапамогі і каментарыі да тыповых памылак з'яўляюцца важным элементам навучання і кантролю ведаў.

Лічыцца, што заняткі прайшлі паспяхова, калі студэнты дайшлі да апошніх рангаў. Пры кантралюючых занятках студэнтам прапануецца паслядоўна пэўная колькасць задач кожнага рангу. У залежнасці ад колькасці і складанасці рошаных задач студэнтам выстаўляюцца адзнакі.

Заняткі ў класе «ЭВНС» па фізічнай хіміі вядуцца ўжо шэсць гадоў. Вопыт паказаў, што студэнты адносяцца да іх добрасумленна.

Вынікі сесій паказалі, што тыя групы, якія рашаюць задачы ў класе «ЭВНС», лепш спраўляюцца з імі на экзаменах.

Зараз у БДУ ёсць яшчэ больш мадэрнізаваны клас — «АТНС». Пры гэтым магчымасці кантролю і навучання студэнтаў павялічваюцца. Прадугледжваюцца падрыхтоўка дзвюх новых праграм і апрабацыя іх на занятках па фізічнай хіміі ўжо ў гэтым навучальным годзе.

**М. РАФАЛЬСКІ,**
**дацэнт хімічнага факультэта.**

● ВУЧОБА — ГАЛОЎНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТА ●

## ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ — НЕЗАЛІК?

— ЧАЦВЁРТАЯ група, хто ў нас падрыхтазаўся?

— Ніхто.

— А што ты так хвалюешся, Наталля? Нібыта ўпершыню...

І гоман дзявочых галасоў зноў вярнуўся да больш істотных пытанняў: як учора правялі вечар? Што сказаў той чарнявы хлапец пры развітанні? Дзе купіць польскую касметыку?.. Да званка на заняткі засталося менш дзвюх мінут.

«...Нібыта ўпершыню». Выраз гэты, кінуты кімсьці так, як гэта ўмеюць толькі людзі, што за словам у кішэню не лазяць, не звярнуў на сябе ніякай увагі. Не ўпершыню — да яго таксама прызвычаіліся, як прызвычаіліся да думкі, што вучыцца — гэта пяць доўгіх гадоў. Амаль тры з іх ўжо атрымалі пэўнае адлюстраванне ў залікоўках. Як кажуць, «студэнцкі экватар» застаўся за плячыма.

А ўсё ж, сапраўды цікава, калі гэта здарылася ўпершыню, што ўся 4-я група трэцяга курса аддзялення рускай мовы філалагічнага факультэта прыйшла на заняткі непадрыхтаванай? Ніхто не памятае. Не, гэта адбылося не ў першыя тыдні вучобы, калі ў аўдыторыі, дзе яны зараз займаюцца, яшчэ панавалі, кажучы ўласнымі словамі студэнтаў, «вялікі час нерасчараваных надзей». І нават не на першым курсе. Але «чым далей вучыліся, тым менш заставалася жадання вучыцца...»

Магчыма, вам здасца, што аўтар сабраўся расказаць пра групу адных двоечнікаў? Гэта не так. Нават, з пэўнай агаворкай, наадварот. Чацвёртая група па выніках вучобы ў мінулым семестры з'яўлялася нават вядучай на сваім курсе. Шаснаццаць чалавек атрымалі на апошніх экзаменах выдатныя і добрыя адзнакі.

...Дзесяць мінут, як пачаліся заняткі. Першая пара — педагогіка. Выкладчык зноў заклікае да парадку. Але пакуль што дарэмна. Дзяўчаты яшчэ толькі рыхтуюца да лекцыі, дастаюць падручнікі, звонка клацаюць клямкамі «дыпламатаў», гучна шоргаюць цэлафанавымі пакетамі. Размова (дакладней, маналог выкладчыка) ідзе пра сістэму выхавання па Сухамлінскаму. Якраз гэты момант для некаторых будучых педагогаў здаўся найбольш зручным для таго, каб навесці ранішні «марафет», папераменна карыстаючыся то люстэркам, то прыладамі з касметычкі.

Немагчыма сцвярджаць, што так пачынаюцца ўсе заняткі ў 4-й групе, і тым больш, што ўсе студэнткі паводзяць сябе іменна так. Не мае сэнсу даваць у гэтым артыкуле і прозвішчы тых, хто іменна так паводзіў сябе на гэтай лекцыі. З'ява, на мой погляд, стала тыповай. Бадай што да яе таксама прывыклі.

Недзе ўжо на сярэдзіне першай гадзіны дзяўчына, што сядзела бліжэй да мяне, дастала са сваёй размаляванай торбы кнігу і, паклаўшы сабе на калені, паглыбілася ў яе змест. Дзве другія з апошняй парты, вельмі зручна ўладкаваўшыся за плячыма аднакурснікаў, шпарка занатоўвалі нешта ў сшыткі з падручнікаў па англійскай мове. Яшчэ адзін патэнцыяльны педагог, закрыўшыся ад выкладчыка значных памераў сумкай, ткнуўся галавой у нязручную для сну дошку стала. На яго твары — асалода дрымотнай самоты. Прывыклі, да гэтага таксама прывыклі.

На перапынку адбываюцца некаторыя змены. З прысутнымі вітаецца спозненая на першую гадзіну дзяўчына. Затое дзве другія спешна развітваюцца. На паверку ў чацвёртай групе на лекцыі з 23 прысутнічае толькі 13 чалавек. Пазней староста Святлана Савельева скажа, што гэта ў той дзень толькі «так атрымалася», але нават па інтанацыі яе голасу зразумела — даўно прывыклі, здараецца і горш.

Дарэчы, сапраўды ж здараецца. Напрыклад, 9 сакавіка на першую пару прыйшло 9 чалавек. А на другую вырашылі наогул не хадзіць. У выніку — сарвалі заняткі па філасофіі. На «здарэнне» імгненна адрэагаваў дэканат: восем чалавек атрымалі вымовы, астатнія таксама панеслі пакаранне. І да гэтага таксама пачалі прывыкаць: «мы проста трапілі пад гарачую руку...», «усё неяк нечакана атрымалася...», «ды што па сутнасці здарылася, ці мы першыя?..»

Патрэбна аддаць даніну аператыўнасці і заклапочанасці камсамольскай арганізацыі філалагічнага факультэта. Ужо ў наступным нумары факультэцкай насценкі паявіўся вялікі артыкул сакратара камітэта камсамола І. Крэтовіч «Аб паспяховасці з усіх пунктаў гледжання». У ім дадзены змястоўны аналіз становішча, якое склалася ў акадэмічным сектары. Вось некаторыя вытрымкі з артыкула: «На большасці курсаў не вядзецца работа па аналізу бягучай паспяховасці студэнтаў. Двойка, нежаданне адказваць на практычных занятках даўно перасталі ўспрымацца як нешта надзвычайнае. Дайшло да таго, што курсавыя бюро ад сесіі да сесіі могуць займацца толькі тымі, хто мае запазычанасці, і не звяртаюць увагі на адзнакі ў бягучым семестры...», «...Па сутнасці акадэмсектар дубліруе работу стараст», «Рэдка, вельмі рэдка на сходах актыву разглядаюцца пытанні аб троечніках...», «Не прыносяць рэальнай карысці сходы, якія не падрыхтаваны і якія праводзяцца не на належным узроўні. Якая карысць, напрыклад, ад камсамольскага сходу, што адбыўся на трэцім курсе рускага аддзялення (камсорг Н. Пісар) у кароткія мінуты перапынку ў кутку аўдыторыі? Які прыклад у вучобе могуць падаць такія камсоргі, як А. Бадак, М. Жабрун, што атрымалі ў сесію двойкі, або С. Кронда і Г. Петухова, што здалі сесію з дзвюма тройкамі?»

Не бяруся разглядаць змест артыкула ўвогуле. Са свайго боку прапанаваў бы аўтару для артыкула другі загаловак. Напрыклад, такі: «Аб паспяховасці з некаторых пунктаў гледжання». З некаторых — таму што аўтар не вызначыў у ім самага галоўнага, што заўсёды забяспечвае поспех у любой справе, і тым больш у вучобе, не падказаў неабходны кірунак дзейнасці камсамольскай арганізацыі. Карацей кажучы, размова ідзе аб элементарнай дысцыпліне. Пра яе ўмацаванне ў артыкуле няма ніводнага абзаца, нават слова такое — «дысцыпліна» — адсутнічае. А ці здольны студэнт, які спазняецца на заняткі, прапускае лекцыі, вучыцца несістэматычна, змяніць становішча ў лепшы бок? Больш таго, ці здолее такі студэнт стаць добрым педагогам? Нерытмічнасць у працы будзе здавацца яму звычайнай справай. Не стаўшы прыкладам для іншых, ён не заваюе аўтарытэту і не здолее патрабаваць дысцыпліны ад другіх.

Давайце зробім неабходныя абагульненні і вывады.

Па-першае: да таго часу, пакуль камітэт камсамола факультэта, яго акадэмічны сектар не стануць той сілай, якая здолее ставіць перад студэнтамі канкрэтныя задачы, і не будуць пільна сачыць за іх выкананнем — становішча не зменіцца.

Па-другое: відавочна, што некаторыя студэнты, засвоіўшы правы, не надта любяць успамінаць пра свае абавязкі. Тое, што дзяржава клапоціцца, каб юнакі і дзяўчаты маглі вучыцца, на льготных умовах карыстацца транспартам, падручнікамі, — у іх вачах асаблівага значэння не мае. Напэўна, кожны выкладчык можа назваць недысцыплінаваных студэнтаў, у якіх няма пачуцця адказнасці, якія з году ў год не робяць нічога своечасова. І тут хочацца запытаць: а атрымліваць стыпендыю, не займаючыся належным чынам, можна? А нявыплачаныя лянівым студэнтам грошы можна было б патраціць на прэміі за выдатную працу, вучобу.

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**наш кар.**

● КАНТАКТЫ ●

# СТУДЭНЦКІ ТРАДЫЦЫЙНЫ

— КАМАНДЗЕ Беларускага дзяржаўнага універсітэта — фізкультпрывет!

— Камандзе Грузінскага дзяржаўнага інстытута фізічнай культуры — фізкультпрывет!

Баскетбалісткі абменьваюцца сувенірамі. Свісток — і ў атаку кідаюцца нашы спартсменкі. Каманды змагаліся за перамогу на традыцыйным студэнцкім турніры, у якім удзельнічалі таксама зборныя Мінскага педінстытута і Інстытута фізкультуры.

Першымі поспеху дабіліся нашы баскетбалісткі. Алена Дадычына (юрфак) здалёку паслала мяч у кальцо саперніц. Намаганнямі Дадычынай, Дамарацкай, Сяверчанкі (мехмат) і Хаткевіч (фізфак) лік расце і дасягае 32:19. Але пасланцы Тбілісі не здаюцца.

Другі тайм пачаўся з лікам 42:38. Гульня ідзе ачко ў ачко, але мінчанкі, сярод якіх вызначыліся разыгрываючыя ігракі Алена Дадычына і Вольга Кантор (ФПМ) лепш гуляюць у атацы. Іх кідкі з сярэдніх дыстанцый амаль кожны раз трапныя. Паскорылі тэмп гульні Фурына (хімфак), Чарнова (мехмат), Маскалёва (геафак), Пугачова (гістфак), і лік зноў пачаў расці. Матч закончыўся перамогай беларускіх баскетбалістак — 89:72.

У студэнцкім традыцыйным турніры першае месца заняла зборная універсітэта.

**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**

● МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ ●

# СЛУХАЧ ПАДРЫХТОЎЧАГА...

...БЕЙРУТ праводзіў Алі грукатам снарадаў і мін, клубамі чорнага дыму, які засціллаў усё навокал. Зруйнаваны, знявечаны горад ваяваў, стойка трымаўся, жыў.

Самалёт узяў разбег, павольна адарваўся ад зямлі. Унізе паплылі ахопленыя пажарам руіны роднага горада. Немагчыма перадаць словамі, што адбывалася ў той момант у душы Алі: радасць ад таго, што збылася яго даўняя мара, і горыч, вялікі боль ад развітання з радзімай.

...Масква сустрэла ліванцаў ласкавымі ўсмешкамі, кветкамі. Шырокія вуліцы, прыгожыя, светлыя дамы, ветлівыя людзі. А ў памяці—ахоплены полымем Бейрут... Не адразу знікла трывога, якая ўвесь час варушылася недзе ў глыбіні сэрца. Але хутка Алі адчуў сябе спакойна і ўпэўнена: ён быў сярод сяброў.

Сайег Алі Махамад даўно цікавіўся мінулым і сённяшнім днём Краіны Саветаў. Яшчэ тады, калі вучыўся на радзіме ў тэхнікуме, а пасля працаваў будаўніком, шмат чытаў і чуў пра жыццё савецкіх людзей. Але сур'ёзна вывучэннем гісторыі СССР ён заняўся пасля таго, як у 1974 годзе стаў членам Ліванскай камуністычнай партыі. Тады ж упершыню пазнаёміўся са спадчынай класікаў марксізму-ленінізму, з перакладзенымі на арабскую мову творамі рускіх і савецкіх пісьменнікаў. Узнікла жаданне сваімі вачыма ўбачыць тое, пра што столькі чытаў, думаў, марыў. Таварышы па партыі дапамаглі яму прыехаць ў Савецкі Саюз.

Сайег Алі Махамад, слухач падрыхтоўчага факультэта:

**— Маёй краіне патрэбны кваліфікаваныя спецыялісты. Рана ці позна вайна скончыцца, над спаленай зямлёй засвеціць мірнае сонца. На месцы руін мы пабудуем новыя прыгожыя дамы, школы, бальніцы. Мае веды патрэбны радзіме, народу. Я імкнуся апраўдаць давер таварышаў па партыі, якія накіравалі мяне вучыцца ў Савецкі Саюз.**

З такімі думкамі Алі Махамад кожны дзень прыходзіць на заняткі, аб гэтым ён, прэзідэнт Ліванскага зямляцтва падрыхтоўчага факультэта, расказвае ў час сустрэч са школьнікамі.

**— За кароткі час я палюбіў вашу краіну, а Мінск стаў для мяне і маіх сяброў родным,— гаворыць Алі.— Мне падабаецца хадзіць па вуліцах, адчуваць сябе часцінкай гэтага вялікага горада. Тут я знайшоў новых сяброў.**

**А. ЯКУБЕЦ,**
**член прэс-цэнтра камітэта камсамола.**

● УСЕ — НА СТАРТ ●

# «ЗЯЛЁНЫ СТАДЫЁН-84»

СЁЛЕТА спаборніцтвы будуць праводзіцца ў адзінаццаты раз, напярэдадзе 10 тураў і фінал. Тры туры (1, 8 і 15 красавіка), а таксама фінальныя спаборніцтвы будуць праведзены ў выхадныя дні з 11 да 14 гадзін, астатнія туры — па серадах з 16 да 19.30.

Адкрыццё прызначана на 1 красавіка. У гэты дзень будзе праводзіцца першы тур. Усе ўдзельнікі прымуць старт у 11 гадзін у парку імя 50-годдзя Кастрычніка. Утвараецца некалькі груп у адпаведнасці з кваліфікацыяй і ўзростам арыенціроўшчыкаў. У групу «А» ўвойдуць найбольш вопытныя спартсмены, якія маюць не ніжэй чым першы разрад. Групу «Б» складуць мужчыны да 40 гадроў і жанчыны да 35 гадоў, якія маюць другі і трэці разрады. Мужчыны старэй за 40, жанчыны не маладзей за 35 гадоў, якія маюць спартыўны разрад, змогуць выступіць у групе «В». Аматары спартыўнага арыентавання, якія не маюць разраду (навічкі), увойдуць у групу «Н». Групу «17» складуць юнакі і дзяўчаты 1967—1969 гадоў нараджэння, а самыя юныя (1970—1972) увойдуць у групу «14».

Як і ў мінулым годзе, прадстаўнікі адной з груп, якія складаюць сям'ю (бацька — сын, маці, бацька, дачка і г. д.), будуць выступаць у групе «С».

Пераможцы ў асабістым заліку вызначаюцца па найбольшай колькасці ачкоў, набраных у васьмі лепшых турах. Ачкі налічваюцца за 25 першых месц па наступнай сістэме: першае месца— 30 ачкоў, другое — 27, трэцяе — 24, чацвёртае — 22, пятае—21 ачко, ...дваццаць пятае месца—адно ачко.

Пераможцы ў камандным заліку вызначаюцца па найбольшай суме ачкоў, набраных заліковымі ўдзельнікамі, якіх усяго пятнаццаць. З групы «А» гэта 2 мужчыны і 1 жанчына, з групы «Б» —3 мужчыны, 3 жанчыны, з групы «В»—1 мужчына, 1 жанчына, з групы «Н»—2 мужчыны, 2 жанчыны.

Больш падрабязна з умовамі спаборніцтва можна пазнаёміцца пры падачы заявак, для чаго неабходна прад'явіць класіфікацыйную кніжку і медыцынскую даведку-допуск ад урача. Заяўку можна падаваць 1 красавіка з 8.00 да 10.00 гадзін.

**С. РЫЖАНКОЎ.**

● РЭПЛІКА ●

# ПАТРАБУЕЦЦА... АБ'ЯВА

**ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!** Калі хто з вас хоць крыху валодае алоўкам ці пэндзлем — дапамажыце!

Вось ужо паўгода адміністрацыя сталовай галоўнага корпуса пакутуе з-за адсутнасці аб'явы аб распарадку работы. На каго толькі не спадзявалася загадчыца вытворчасці А. А. Ільіна: і на каменданта галоўнага корпуса, і на старшыню прафсаюзнага камітэта, і на інжынера па харчаванню... Цяпер вось нават на друкарню спадзяецца. А пакуль што аб тым, калі адчыняецца сталовая, ведаюць толькі яе работнікі. Дык будзьце ласкавы, дапамажыце!

**Т. ШЫПКОВА,**
**член штаба «Камсамольскага пражэктара» універсітэта.**

**АД РЭДАКЦЫІ.** Шаноўныя кіраўнікі сталовай галоўнага корпуса! Напамінаем вам, што на выступленні ў друку неабходна рэагаваць своечасова. У газеце за 12 студзеня быў змешчаны трывожны сігнал. «Апетытны абед — не апошняя справа». Ад вас пакуль не чуваць нічога. Як гэта параіце разумець! Магчыма, вы таксама даручылі каму-небудзь даць адказ рэдакцыі!

● АГЛЯД-КОНКУРС МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ ●

# БЫЛІ Б ЭНТУЗІЯСТЫ!..



КАЖУЦЬ, што ў сённяшняй моладзі знік энтузіязм. Вы згодны з гэтым? Я — не. Уся справа ў тым, што часам у нашай грамадскай рабоце мы самі робім сабе паблажкі: адзін раз—не пажадалі, другі—проста не выканалі, трэці... А за ім пяты, дзесяты. Так паяўляецца пасіўнасць. Вось з ёю мы і сутыкнуліся ў мінулым годзе, калі рыхтаваліся да агляду мастацкай самадзейнасці. Не змаглі тады перамагчы пасіўнасць, не хапіла сіл, а магчыма—і проста жадання. Але ў гэтым годзе вырашылі: далей так нельга. А тут яшчэ на факультэце паявіўся мастацкі кіраўнік — Ірына Анатольеўна Панамарова, дзякуючы якой стварылі студэнцкі тэатр мініяцюр. Адбылося яго першае выступленне на канферэнцыі, прысвечанай падвядзенню вынікаў летняй практыкі, потым — вечар пасвячэння першакурснікаў у студэнты, віншаванне выкладчыкаў факультэта — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. І вось зноў агляд мастацкай самадзейнасці. Што ён прынясе факультэту? Хваляваліся ўсе: і ўдзельнікі, і гледачы, і асабліва адказная за падрыхтоўку канцэрта Таццяна Дзмітрыеўна Арлова. Яшчэ на апошняй рэпетыцыі не ўсё ладзілася. Аднак роўны, чатырохгалосы спеў хору адразу ж зняў усё напружанне, хваляванне. Хор, музычная кампазіцыя «Балада аб чатырох заложніках» у выкананні вакальна-інструментальнага ансамбля, урывак з драмы А. Дударава «Выбар» — гэтыя і іншыя нумары канцэрта праходзілі перад вачыма гледачоў і журы. А жартоўныя рэпрызы членаў імправізаванай рэдакцыі А. Эзерына, В. Вашкевіча, С. Карпяковай былі не проста звязкамі паміж асобнымі выступленнямі, а настройвалі гледачоў на лірычны лад, падрыхтоўвалі да наступнага нумара.



І самі гледачы не заставаліся ў даўгу: ад душы апладзіравалі і ўдзельнікам танцавальнай групы, у выкананні якой асабліва запомніўся цудоўны чарльстон, і вясёламу студэнцкаму дыксіленду і іншым нумарам.

Маладосць. Каханне. Хіба не хвалюе нас гэта? Іменна такія тэмы прагучалі ў мініяцюрах студэнцкага тэатра. І самі ўдзельнікі невялікага спектакля бачылі ў вачах гледачоў, сваіх аднагодкаў, падтрымку і захапленне.

Былі ў нашым канцэрце і памылкі. Хто ж ад іх застрахаваны? Але галоўнае, што канцэрт спадабаўся ўсім.

**І. СУШКЕВІЧ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола журфака па культурна-масавай рабоце.**

**НА ЗДЫМКАХ:** апошняя рэпетыцыя калектыву мастацкай самадзейнасці журфака.

Фота **С. Плыткевіча.**



